**УДК 94(476)**

# ГРАМАДСКА-ГАСПАДАРЧЫ АСПЕКТ ПАЎСЯДЗЁННАГА ЖЫЦЦЯ НАСЕЛЬНІЦТВА ПОЛАЦКА-ЛЕПЕЛЬСКАЙ ПАРТЫЗАНСКАЙ ЗОНЫ

***Н.Н. КАДУШКА***
***(Прадстаўлена: канд. гіст. навук, дац. А.І. КОРСАК)***

*На тэрыторыі Полацка-Лепельскай партызанскай зоны з вызваленнем яе ад нямецкіх захопнікаў былі адноўлены савецкія органы кіравання. Насельніцтва партызанскай зоны жыло па законах ваеннага часу. Важным момантам функцыянавання і ўзаемадзейнасці партызан і мясцовага насельніцтва было выкананне з боку першых загадаў ваеннага камандвання. У той самы час выпадкі дысцыплінарных парушэнняў, фактараў маральна-бытавога разлажэння – п'янства і марадзёрства рабілі свае адбіткі на свядомасць мясцовага насельніцтва і фарміравалі адпаведныя адносіны і стаўленне.*

*Пытанне забеспячэння насельніцтвам партызан харчовымі прадуктамі першы час насіла стыхійны характар з боку партызан, якія карысталіся сваім "прывелігераваным" становішчам і дазвалялі сабе рабаваць сялянскія ўладанні. Становішча процістаяння былі характэрнымі для сельскіх раёнаў, якія кантраляваліся партызанамі. Насельніцтва толькі напружаннем усіх сваіх сіл несла на сабе падвойную нагрузку – неабходнасць забеспячэння харчаваннем, іншымі прадуктамі земляробства і жывёлагадоўлі, саматужнай вытворчасці як саміх сябе, так і партызан.*

У дадзеным артыкуле на падставе архіўнага матэрыяла Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь і апублікаваных успамінаў сведкаў тых падзей разгладаецца грамадска-гаспадарчы аспект паўсядзеннага жыцця насельніцтва Полацка-Лепельскай партызанскай зоны ў 1942 – 1944 гг.

Да верасня 1941 г. тэрыторыя Беларусі была поўнасцю падпарадкавана нацысцкім уладам, а каля 8 млн. чалавек па тых ці іншых прычынах засталося ў зоне нямецкай акупацыі. Аб масавасці партызанскага руху на яе тэрыторыі сведчыць і наяўнасць вызваленых ад нямецкіх акупантаў тэрыторый – партызанскіх зон, якія існавалі ў 9 з 10 абласцей БССР, ахоплівалі каля 60 % яе тэрыторыі – звыш 38 тыс. кв. км складалі партызанскія зоны [4, с. 116].

Усяго на акупіраванай тэрыторыі Беларусі ў розны час існавала 25 партызанскіх зон. У іх дыслацыраваліся не толькі партызанскія фарміраванні, але і пражывала мясцовае насельніцтва.

На працягу 1942 – 1943 гг. партызаны здолелі выцесніць нямецкіх акупантаў са значнай тэрыторыі, дзе ўтварыліся партызанскія зоны са шматлікім насельніцтвам, у тым ліку Полацка-Лепельская партызанская зона, створаная ў восень 1942 г. на базе партызанскага атраду "Смерць фашызму" [4, с. 118]. Тэрытарыяльна размяшчалася ад Полацка на поўначы да Лепеля на поўдні, ад Вілейскай вобласці на захадзе да ракі Заходняй Дзвіны на ўсходзе, дзе знаходзілася 1 220 населеных пунктаў з агульнай колькасцю насельніцтва 80 тысяч чалавек, у тым ліку бежанцаў з іншых раёнаў. Абаранялі зону 16 партызанскіх брыгад (17,5 тыс. чалавек), былі створаны абарончыя рубяжы з сістэмай акопаў, дзотаў, мінных палёў [4, с. 120].

У партызанскіх зонах і краях аднаўляліся органы савецкай ўлады, дзейнічалі абласныя, міжраённыя і раённыя камітэты КП(б)Б і ЛКСМБ, партыйныя арганізацыі, у вызваленых раёнах ствараліся таксама выканкамы Саветаў дэпутатаў працоўных, якімі былі прызначаны партызанскія упаўнаважаныя і каменданты ў сельсаветы, у вёсцы – старасты [4, с. 116]. Для аховы грамадскага парадку і барацьбы з варожымі дыверсантамі ствараліся атрады і групы самааховы. Для каардынацыі дзеяння партызанскіх брыгад у канцы 1943 года па загадзе начальніка Цэнтральнага штаба партызанскага руху П.К. Панамарэнка была створана аператыўная група на чале з сакратаром Лепельскага падпольнага РК КП(б)Б У.Е.Лабанком [4, с. 123].

Партызанская зона жыла па законах ваеннага часу, таму функцыянавалі партызанскія суды, якімі за амаральныя ўчынкі (п'янства, марадзёрства і інш. злачынствы) было расстраляна больш 2 300 чалавек [4, с. 123]. У той жа самы момант нельга пакідаць па-за ўвагай і чалавечы фактар, калі законы ваеннага часу выкарыстоўваліся з мэтай вырашэння ўласных пытанняў. Так, даследчык партызанскага руху М. Бартушка ў сваёй працы "Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941 – 1944 гг" звяртае ўвагу, што злачынства ў ваенны час – звычайная з'ява, як і подзвіг. Марадзёрства, здзекі над людзьмі – усё гэта суправаджала бітвы незалежна ад таго, у якую эпоху і ў якой краіне яны адбываліся. Камандзіраў было складана кантраляваць, і дазволеная ім ступень гвалту магла, з аднаго боку, прывесці да злоўжывання ўладай, а з другога – быць прыкладам і для ніжэйшых чыноў. Цэнтр і яго прадстаўнікі на месцах спрабавалі змагацца з гвалтам ў дачыненні паміж партызанамі, з нападамі на насельніцтва і злоўжываннямі, аднак у гэтых умовах поўны поспех быў малаімаверны [2, с. 83].

Жанчыны ў партызанскіх атрадах асабліва адчувалі на сабе гэтую атмасферу, паколькі павага да іх

як збольшага не актыўных байцоў была невялікай. Інстытузаваны гвалт, які мусіў забяспечыць дысцыпліну і баяздольнасць атрадаў, быў вынікам абставінаў, але магчыма яго разглядаць і як сістэмную з'яву. Шмат хто з байцоў прызначаўся да смерці і гвалту. Таму яны вытрымлівалі складаныя ўмовы, хоць дастаткова лёгка самі ўжывалі сілу. Тая лёгкасць, з якой выносіліся рашэнні аб смяротным пакаранні для калабарантаў і для іх баявых таварышаў, безумоўна знізіла абмежаваныя бар'еры [2, с. 85].

Так, згодна з загадам камандзіра 1-ай Беларускай партызанскай брыгады Полацка-Лепельскай зоны ад 26 кастрычніка 1942 г. не гледзячы "на неаднаразовыя папярэджанні асабістага складу брыгады аб катэгарычнай забароне партызанамі вырабляцьператрусы, забіраць рэчы, наносіць мірнаму насельніцтву абразы і пабоі, усё ж і да гэтага часу шкодная і антысавецкая практыка існуе і цяпер. Байцы-партызаны самавольна вырабляюць рабаванні. Так, група партызан пад камандаваннем камандзіра ўзвода В.Ф. Барысава, атрымаўшы заданне злавіць збеглага з-пад арышту, замест выканання пастаўленай задачы занялася марадзёрствам і збіццём насельніцтва ў вёсцы Вайцяхі. Па камандзе Барысава партызаны М.А. Кісялёў і Г.С. Міляеў напалі на безабаронных грамадзян П. Дзямідзенка і маленькага 2-х гадовага сына. Забралі рэчы, якія належаць Дзямідзенка, і схаваліся нікому пра гэта не далажыўшы. Арганізатарам дадзенага тэрарыстычнага бандыцкага акта з'яўляюцца Барысаў, Кісялёў. За марадзёрства і збіццё мірнага насельніцтва, за рабаванне і гвалт аддадзены загад расстраляць іх" [10, л. 17–18].

Факт марадзёрства зафіксаваны ў копіі заявы старшыні калгаса "Шлях сацыялізма" ўпаўнаважанаму НКУС т. Лукашову. Так, у ноч з 12 на 13 кастрычніка ў хату калгасніка К. зайшлі двое ўзброеных людзей. Ад гаспадара яны патрабавалі самагон, якога ў яго не было. Двое ўзброеных пасля вобыску на гарышчы не знайшлі самагону і нанеслі Кавалеўскаму ўдары прыкладам з патрабаваннем выдачы самагону, нават прапаноўвалі на абмен соль [11, л. 32–33].

З пачаткам вайны не ўсюды і не ўсе мясцовыя жыхары аднолькава прыхільна ставіліся да партызанскага руху. Гэтая з'ява залежала ад мнгіх фактараў: ад наяўнасці ў складзе партызанскіх атрадаў родных і сваякоў, ад месцараспалажэння партызанскіх фарміраванняў і іх складу і г.д. Часам так званыя лжэпартызанскія атрады мэтанакіравана рабілі спробу дыскрыдытацыі партызан у вачах мясцовага насельніцтва.

У той самы час мясцовыя жыхары пастаянна папаўнялі асабовы склад партызанскіх атрадаў, збіралі і перадавалі зброю і боепрыпасы, дапамагалі праводзіць баявыя аперацыі, вялі разведку, прымалі ўдзел ў будаўніцтве абарончых збудаванняў і партызанскіх аэрадромаў. Сяляне забяспечвалі партызан харчамі, вопрыткай і абуткам. Са свайго боку партызаны абаранялі мясцовае насельніцтва ад акупантаў, хавалі жыхароў у партызанскіх зонах, дапамагалі ў сельскагаспадарчых работах [5, с. 117].

Зыходзячы з установак, якія атрымлівалі з-за лініі фронту, свайго разумення абставін, органы партызанскага кіравання будавалі ваеннагаспадарчую дзейнасць насельніцтва і паўстанцкіх фарміраванняў у зонах, палітычную работу ў масах. Вялікае значэнне надавалася наладжванню сельскагаспадарчай вытворчасці. Ва ўмовах пастаяннай небяспекі ўварвання карнікаў, негатыўнай настроенасці сялянства ў асноўнай сваёй масе да калгаснага вопыту 1930-х гг., а таксама пад уплывам пераходу да індывідуальных форм працы ў сельскіх мясцовасцях, што кантраляваліся гітлераўцамі, калектыўныя гаспадаркі ў партызанскіх зонах, за рэдкім выключэннем, не аднаўляліся. Па дамоўленасці свае надзелы сяляне апрацоўвалі як індывідуальна, так і супольна.

Адчуваючы вострую патрэбу ў харчах, значную дапамогу ў сельскагаспадарчых работах, уборцы ўраджаю аказвалі насельніцтву партызаны, у тым ліку многія мясцовыя жыхары, якія пайшлі са зброяй у руках у лясы і ў неабходны момант вярталіся да мірнай працы земляроба з мэтай дапамогі сем'ям, родзічам, аднавяскоўцам. Нягледзячы на тое, што камандванне партызанскіх фарміраванняў давала значную працоўную сілу, коней, назіраўся агульны ўпадак ураджайнасці, прадукцыйнасці палеткаў з-за ваеннай разрухі. Становішча процістаяння былі характэрнымі для сельскіх раёнаў, якія кантраляваліся партызанамі. Насельніцтва толькі напружаннем усіх сваіх сіл несла на сабе падвойную нагрузку – неабходнасць забеспячэння харчаваннем, іншымі прадуктамі земляробства і жывёлагадоўлі, саматужнай вытворчасці як саміх сябе, так і партызан. Людзі настроеныя патрыятычна, літаральна адрываючы ад сябе і сваіх дзяцей апошняе, забяспечвалі байцоў партызанскіх атрадаў і брыгад усім, чым маглі. У менш свядомых таксама не заставалася лішкаў – дзейнічала сістэма планавых нарыхтовак партызанамі прадуктаў, матэрыяльных сродкаў у прывязцы да канкрэтных мясцовасцей, населеных пунктаў [6, с. 530].

Згодна распараджэння прадстаўніка ЦК КП(б)Б і БШПР У.Е. Лабанка аб падрыхтоўцы да веснавой сяўбы ад 7 красавіка 1944 г. для забеспячэння насельніцтва і партызан прадуктамі, аператыўная група ЦК КП(б)Б і БШПР прапаноўвала сакратарам РК КП(б)Б, камандзірам і камісарам партызанскіх брыгад Полацка-Лепельскай партызанскай зоны правесці "наступныя мерапрыемствы:

1. У замацаваных за брыгадамі і атрадамі населеных пунктах арганізаваць працу па падрыхтоўцы да веснавой пасяўной. Правесці адпаведную палітыка-масавую працу сярод насельніцтва па гэтаму пытанню.

2. Імкнуцца да засявання ўсёй пасяўной плошчы кожным дваром. Прадпрыняць усе меры, каб пасяўную правесці на выкосім агратэхнічным узроўні, выкарыстоўваючы ўсе віды мясцовага ўгнаення.

3. Правесці ўлік запасаў бульбы, зернавых культур у кожным доме, за кошт пераразмеркавання іаказання дапамогі асобным сем’ям забяспечыць насеннем кожную сям’ю замацаваных вёсак, у тым ліку і бежанцаў, якія пражываюць у нашай зоне.

4. Усталяваць строгі кантроль за захаваннем насення, не дапусціць выпадкаў выкарыстання насення не па назначэнню.

5. Строга забараніць партызанам браць коней у сялян на розныя перавозкі без згоды камандвання брыгад.

6. Прымусіць грамадзян, якія маюць коней, прыняць меры да паляпшэння іх стану.

7. Правесці працу па падрыхтоўцы буйной рагатай жывёлы для палявых прац.

8. Выдзеліць частку коней партызанам на перыяд пасяўной кампаніі.

9. Для арганізацыі рамонту сельскагаспадарчага інвентару адпусціць усіх партызан-кузняцоў тэрмінам на 15 дзён, раўнамерна размеркаваць іх па вёсках сваёй зоны.

10. З улікам таго, што цяглавай жывёлы ў зоне не дастаткова, кожнаму двару набыць 2-3 жалезныя лапаты і матыкі для выкарыстоўвання іх для ручной апрацоўкі зямлі.

11. З мэтай паляпшэння санітарнага стану ў раёнах у пяцідзённы тэрмін арганізаваць закопванне на глыбіню не менш 2 м памерлых коней і іншай жывёлы, якія валяюцца па дарогах і ў полі.

Аператыўная група звяртае ўвагу раённых камітэтаў КП(б)Б і камандвання партызанскіх брыгад, што вясенняя пасяўная кампанія 1944 г. у нашай зоне будзе праходзіць у складаных умовах, у тылу нямецкіх акупантаў. Выкананне гэтай задачы патрабуе ад нас намагання сіл і мабілізацыі ўсіх нашых магчымасцей дзеля таго, каб у складаных умовах засеяць усю пасяўную плошчу і ў кароткія тэрміны” [9, с. 275].

Пытанне прадуктазабеспячэння стала кантраліруемым толькі летам 1943 г. Усе вёскі былі размеркаваны і замацаваны паміж атрадамі. Паколькі сяляне на акупаваных тэрыторыях не мелі магчымасці выконваць дзяржпастаўкі, іх клопатам стала забеспячэнне партызанскіх атрадаў. Партызаны кармілі сябе таксама “за кошт захопу мукі, збожжа, жывёлы і інш. у нямецкіх маёнтках, за кошт захопу са складоў ворага, згону жывёлы паліцыянтаў і захопу іх прадуктаў харчавання”. Сярод вайсковых дакументаў сапраўды ёсць справаздачы аб баявых аперацыях на “складах праціўніка”. Аднак былі і іншыя паперы – скаргі сялян на партызан. Вось тэкст падобнай заявы, якая была напісана ў мясцовыя органы НКВД: “22 чэрвеня 1943г. партызанамі атрада “За Савецкую Беларусь” ўзята кароўка рабы масці, якая ў мяне адна. З гаспадаркі больш нічога не маю. Сям’я мая складаецца з двух чалавек і трох дзяцей беспрытульных, бацькі якіх пагарэлі”. Па словах жыхароў вёсак, “рабаўніцкія нарыхтоўкі” адрозніваліся ад карных экспедыцый немцаў толькі тым, што адны казалі па-руску, а іншыя – па-нямецку” [1].

Важнае значэнне ва ўзаемаадносінах партызан з насельніцтвам мела аказанне мясцовым жыхарам медыцынскай дапамогі. Ва ўмовах акупацыі санітарны стан, здароўе людзей патрабавалі пэўнай увагі. У тыле ворага прыходзілася вырашаць пытанні медыцынскага абслугоўвання партызан і насельніцтва, ствараць медпункты, знаходзіць урачоў, неабходныя лекі. У выніку бохьшасць партызанскіх фарміраванняў стварылі свае шпіталі і медпункты. Яны мясціліся на базах брыгад у лясах, ці ў населеных пунктах, якія абаранялі партызаны. У партызанскіх зонах жанчыны дапамагалі даглядаць параненых, мыць бялізну, перавязачныя матэрыялы [5, с. 120].

Як элемент грамадска-гаспадарчага жыцця ў зонах патэбна адзначыць і асабістую вытворчую дзейнасць партызан, у першую чаргу наладжванне працы розных кустарных майстэрань, а таксама дробных прамысловых прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў падкантрольных народным мсціўцам населеных пунктах, у лясных лагерах. У Полацка-Лепельскай зоне працавалі два шкіпінарна-дзягцярных заводы. 80 слясарна-кузнечных, 54 гарбарных і 47 сталярна-бандарных майстэрань, ганчарнае прад-прыемства, тры электрастанцыі, шэсць млыноў, 20 маслазаводаў, дзе перапрацоўвалася семя льну. Малая партызанская вытворчасць шырока выкарыстоўвала майстэрства кадравых рабочых, якія сталі партызанамі або перасяліліся ў партызанскія зоны, уменне і навыкі ваеннаслужачых, сялян-умельцаў [6, с. 530].

Пра стан забеспячэння партызан вопраткай даюць інфармацю ўспаміны байца партызанскай брыгады У.Е. Лабанка А. Ханяка: “Матэрыял быў вельмі трывалы і тонкі, прыдатны для пашыву бялізны. Швейныя майстэрні шылі для партызан кашулі, кальсоны. Я таксама насіў кашулю з парашута. Мне выдалі таксама нямецкі касцюм-фрэнч і штаны. І я хадзіў у ім да вызвалення Беларусі. Дыхтоўную нямецкую форму насілі многія партызаны. Праўда, часам прыводзіла гэта да кур’ёзных сітуацый” [3].

Для забеспячэння партызан зброяй у Полацка-Лепельскай зоне існавала збройная майстэрня ў брыгадзе “Дубава”. Рамантавалі, працавалі над стварэннем новай Апанас і Міна Цар, майстар-цясляр Фёдар Пярэдня, слесар Аляксандр Скрыжонак [10, с. 288].

Садзейнічала выхаванню патрыятызму і мабілізоўвала на барацьбу з ворагам партызанская мастацкая самадзейнасць. Калектывы мастацкай самадзейнасці партызан існавалі ў форме агітбрыгад, агіт-

атрадаў. У праграмах іх выступленняў былі песні, прыпеўкі, танцы, байкі, вершы, сатыр. Так, згодна ўспамінаў У.Е. Лабанка: "Пачалася мастацкая самадзейнасць з выканання Сцяпанам Антонавічам Пад'ельскім знаёмай і незнаёмай, блізкай і далёкай песні "Крутится, вертится шар голубой". У хуткім часе сярод партызан знайшліся танцоры, спевакі, расказчыкі, паэты. Любілі сваю самадзейнасць партызаны, не чулі ў ёй душы мясцовыя жыхары. Кожнае выступленне самадзейных артыстаў было сапраўдным святам. На канцэрце ў Кублічах гурткоўцаў прынялі за артыстаў з-за лініі фронту" [7, с. 284].

На тэрыторыі Полацка-Лепельскай зоны пасля вызвалення яе партызанамі і ўсталявання іх кантролю, быў адноўлены даваенны савецкі ўклад, які пры гэтым падпарадкоўваўся патрэбам ваеннай рэчаіснасці. Нягледзячы на спрэчнасці і складанасці савецкага грамадскага развіцця, у многіх жыхароў рэспублікі да пачатку вайны выпрацавалася пачуццё прыналежнасці да адзінай краіны – СССР. Вельмі многія ўраслі ў савецкую сістэму, з большай ці меншай ступенню шчырасці верылі ў сацыялізм, сацыялістычную ідэю і падняліся змагацца і за яе і за родную зямлю, якую зняволілі чужынцы. Зыходзячы з установак, якія атрымлівалі з-за лініі фронту, свайго разумення абставін, органы партызанскага кіравання будавалі ваеннагаспадарчую дзейнасць насельніцтва і паўстанцкіх фарміраванняў у зонах, палітычную работу ў масах. Вялікае значэнне надавалася наладжванню сельскагаспадарчай вытворчасці. Як элемент грамадска-гаспадарчага жыцця ў зонах патэбна адзначыць і асабістую вытворчую дзейнасць партызан, у першую чаргу наладжванне працы розных кустарных майстэрань, а таксама дробных прамысловых прадпрыемстваў, якія дзейнічалі ў падкантрольных партызанам населеных пунктах, у лясных лагерах. Важнае значэнне ва ўзаемаадносінах партызан з насельніцтвам мела аказанне мясцовым жыхарам медыцынскай дапамогі. Ва ўмовах акупацыі санітарны стан, здароўе людзей патрабавалі пэў-най увагі. Садзейнічала выхаванню патрыятызму і мабілізоўвала на барацьбу з ворагам партызанская мастацкая самадзейнасць.

ЛІТАРАТУРА


1. Абрыньба, М. І. Паветраны змей / М. І. Абрыньба // Памяць: Лепел. р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл.: В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; рэдкал.: В. Я. Ланікіна [і інш.]. – Мінск. : Беларусь, 1999. – С. 280–281.
2. Бартушка, М. Партызанская вайна ў Беларусі ў 1941–1944 гг. / М. Бартушка. – Вільня : Інстытут беларусістыкі ; Беласток : Беларускае гістарычнае таварыства, 2011. – 188 с.
3. Быт белорусских партизан: удивительно, но партизаны во время войны очень редко болели [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа: http://www.ctv.by/node/43019. – Дата доступа: 11.03.2016.
4. Коршук, У. К. Узаемаадносіны партызан і мірнага насельніцтва Беларусі ў гады Вялікай Айчыннай вайны / У. К. Коршук // Вклад белорусского народа в Великую победу : материалы респ. научн.-практ. конф., Минск, 27 ноября 2009 г. / редкол.: Е. А. Гребень (отв. ред.) [и др.]. – Минск : БГАТУ, 2010. – С. 117–120.
5. Кузьменка, У. Жыццё насельніцтва ў гады акупацыі / У. Кузьменка // Гісторыя Беларусі : у 6 т. – Мінск, 2007. – Т. 5. Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч, М. Касцюк (гал. рэд.). – Мінск, 2007. – С. 518–533.
6. Лабанок, У. Е. Партызанскі баян / У. Е. Лабанок // Памяць: Лепел. р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл.: В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; рэдкал.: В. Я. Ланікіна [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1999. – С. 284.
7. Полацкі этнаграфічны зборнік : у 2 ч./ уклад., прадм. і паказ. У. А. Лобач. – Наваполацк : ПДУ, 2011. – Ч. 2 : Народная проза беларусаў Падзвіння. – 368 с.
8. Распараджэнне прадстаўніка ЦК КП(б)Б і БШПР У. Е. Лабанка ад падрыхтоўцы да веснавой сяўбы // Памяць: Лепел. р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл.: В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; рэдкал.: В. Я. Ланікіна [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1999. – С. 274–275.
9. Ханяк, А. С. Рабілі зброю партызаны / А. С. Ханяк // Памяць: Лепел. р-н: гіст.-дак. хронікі гарадоў і р-наў Беларусі / укл.: В. Я. Ланікіна, А. У. Стэльмах ; рэдкал.: В .Я. Ланікіна [і інш.]. – Мінск : Беларусь, 1999. – С. 288–289.
10. Приказ по 1-ой белорусской партизанской бригаде от 26.10.1942 г. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1403. Воп. 1. Спр. 48.
11. Копия заявления уполномоченному НКВД т. Лукашову. // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 1403. Воп. 1. Спр. 48.